Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ

# ЗА ПАРТЫЙНАСЦЬ ЛІТАРАТУРЫ

Беларуская пралетарская літаратура можа рапартаваць партыі, усяму рабочаму класу аб выдатных сваіх перамогах.

Упарта змагаючыся з класавымі ворагамі на літаратурным фронце, пралетарскі атрад літаратуры, пад кіраўніцтвам партыі, ідэйна загартоўваецца, развіваючы моцны рух творчага поступу наперад.

З якой шалёнай нянавісцю імкнуліся класавыя ворагі пралетарыяту паралізаваць фармаванне атраду пралетарскай літаратуры – БелАПП!

Паслядоўна і ўдумна агентура беларускай контррэвалюцыі "апрацоўвала" асобных менш устойлівых пісьменнікаў, зацямняла іх розум імглою буржуазнай культуры, прышчапляла ім, што а[illegible] ідэалізацыю "залатога веку" Беларусі.

Але, пралетарскай сілай нанесены руйнуючы ўдар найміта дэфензівы – буржуазным нацыянал-дэмакратам. Расце ў масах беларускі пралетарскі літаратурны рух. Усё шырэй і шырэй пранікае пралетарская літаратура ў гушчы рабочага класа, становіцца вядучым атрадам усёй савецкай літаратуры БССР.

Пралетарская літаратура з"яўляецца моцнай зброяй у руках партыі, арганізуючай сілай энтузіязму, волі, думак і пачуццяў рабочага класа на рыштаваннях сацыялістычнага будаўніцтва, на барацьбу з класавым ворагам, заклікаючы герояў будаўніцтва, рабочых-ударнікаў у свае рады.

Першыя крокі закліку герояў рабочага класа ў літаратуру далі плённыя вынікі.

Вырашаць задачы, што стаяць перад пралетарскай літаратурай, вызначыць шляхі для заваявання гегемоніі пралетарскай літаратуры ў найкарацейшыя гістарычныя тэрміны на канферэнцыі Мінскай Асацыяцыі Пралетарскіх Пісьменнікаў будуць сёння і новыя сілы - аўтары рабочыя-ўдарнікі, закліканыя ў літаратуру.

Гэта новае ў гісторыі пралетарскага літаратурнага руху з"яўляецца вялікай перамогай камуністычнай партыі, кіраўніка барацьбы за вялікае мастацтва бальшавізму. Падкрэсліваючы значны рост, безумоўны поспех пралетарскай літаратуры, мы абавязаны выразна падкрэсліць факт адставання літаратуры ад разгорнутых тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Не аслабляць класавай барацьбы на літаратурным фронце, выяўляць і знішчаць праяўленні велікадзяржаўнага шавінізму, носьбітаў нацыянал-дэмакратычнай ідэалогіі, накіроўваць агонь на два фронты - на правых і "левых", узбройвацца ленінізмам, узняць творчую актыўнасць, дзейна ўключыцца ў рады будаўнікоў сацыялізму - вось шлях ліквідацыі адставання літаратуры.

Вялікай задачай МенАПП"у з"яўляецца выхаваўчая работа сярод папутнікаў пралетарскай літаратуры: дапамагчы ім стаць на шлях саюзніка, аўладаць ленінскім метадам - метадам марксісцкай дыялектыкі.

Выключна важнай задачай МенАПП"а і ўсяго пралетарскага літаратурнага руху БССР з"яўляецца разгортванне самакрытыкі. Ідэйна аздараўляючы свае рады, стварыць умовы творчага росту рабочых-ударнікаў у літаратуры, наладзіўшы сістэматычнае вы-

хаванне сваіх унутраных папутнікаў, змагацца з фактамі зруху ўправа некаторых пісьменнікаў. Таму ўсю сваю работу мы павінны праводзіць пад знакам "сумленнай рэвалюцыйнай самакрытыкі. Без гэтага няма руху наперад. Без гэтага няма развіцця". (Сталін).

Ліст тав.Сталіна ў часопіс "Пралетарская рэвалюцыя" - "Пра некаторыя пытанні гісторыі бальшавізму" мае для пралетарскага літаратурнага руху асаблівае значэнне. Вынікае абавязак не аслабляць масава-палітычнай работы на літаратурным фронце, актывізаваць творчасць, павялічыць якасна і колькасна творчую прадукцыю, даваць творчасць партыйную ў бальшавіцкім разуменні гэтага слова.

Каб забяспечыць круты ўздым у вышыню пралетарскай літаратуры, неабходна шырока разгарнуць творчую дыскусію. Выявіць і выкрыць усё варожае ў мастацкай творчасці і крытыцы, змагаючыся за ленінізм у літаратуры.

Канферэнцыя Мінскай Асацыяцыі Пралетарскіх Пісьменнікаў - найлепшы сродак пачатку разгортвання вялікай творчай дыскусіі, што забяспечыць поспех далейшага творчага росту.

Канферэнцыя Мінскай Асацыяцыі Пралетарскіх Пісьменнікаў склікаецца ў баявы час класавай барацьбы і сацыялістычнага росту. Усе задачы пад кіраўніцтвам партыі канферэнцыя вырашыць з поспехам і вызначыць далейшыя шляхі барацьбы за гегемонію беларускай пралетарскай літаратуры.

Беларуская пралетарская літаратура на канферэнцыю прыходзіць з высока ўзнятым сцягам камуністычнай партыі ў змаганні за вялікае мастацтва, вартае вялікай эпохі пабудовы сацыялізму.

"Звязда",1931,25/XI,№ 317(4223)с.3.